**Г. Л. Случанка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры гімназіі №19 г. Орша

# «Зямля навагрудская, краю мой родны…»

## Метадычная распрацоўка ўрока беларускай літаратуры ў 10 класе

## ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА УРОКА

**Вывучаемы раздзел:** А. Міцкевіч (2 гадзіны).
**Месца ўрока па дадзенай тэме:** 1 урок.
**Тэма ўрока:** «Тугою па табе тут вобраз твой ствараю»: Вобраз радзімы ў лёсе і творчасці А. Міцкевіча.

**Мэты урока:**
- сфарміраваць веды аб жыццёвым і творчым шляху А. Міцкевіча, садзейнічаць асэнсаванню патрыятычнага кірунку ў яго творчасці;
- стварыць умовы для развіцця крытычнага мыслення праз работу з храналагічнымі табліцамі, класцерам, аналіз літаратурных твораў, фарміраваць навыкі пошукавай дзейнасці;
- стварыць умовы для выхавання адказнасці, развіцця камунікатыўнай культуры вучняў, цікавасці да гістарычнага мінулага, літаратурнай спадчыны праз стварэнне на ўроку творчай атмасферы, якая акажа глыбокае эмацыянальнае ўздзеянне на вучняў.

**Тып урока:** урок паглыблення ведаў.
**Тэхналогія:** развіцця крытычнага мыслення.

### Ход урока

**1. Арганізацыйны этап**
Стварэнне эмацыянальнага настрою.
Эпіграф (слайд № 1) Чытае настаўнік

*Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:*
*Не цэнім, маючы, а страцім залатое –*
*Шкада, як і красы твае, мой родны краю.*
*Тугою па табе тут вобраз твой ствараю*
Чые словы? На якую думку наводзяць радкі?

**2. Вызначэнне мэтаў урока**
Слайд 2
Словы настаўніка:
Вы здагадаліся, што будзем весці гутарку пра А. Міцкевіча, які належыў да тых паэтычных талентаў, хто вельмі любіў сваю радзіму і прысвяціў ей шмат паэтычных радкоў.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

Наша задача: Далучыцца да шэдэўраў сусветнай літаратуры, завочна наведаць родную для Міцкевіча Навагрудчыну, каб паспрабаваць спасцігнуь душу паэта, зведаць таямніцы яго душы, у якой хаваюцца ЛЮБОЎ і адначасова ТУГА па радзіме, боль аб няспраўджанным каханні.

**3. Актуалізацыя ведаў**

Слова настаўніка пра вяртанне імені Міцкевіча.

Праходзіць час, і да нас вяртаюцца імёны беларусаў, якіх узгадавала беларуская зямля і якія не змаглі праявіць сябе на Радзіме і вымушаны былі па розных прычынах праслявіць сябе ў іншых землях і іншых краінах (слайд №4 са спісам выдатных асоб Беларусі)

Звярніце увагу. Перад вамі далёка не поўны спіс асоб. Сярод іх – імя А. Міцкевіча

→ класіка польскай літаратуры

→ пачынальніка польскага рамантызму, якога нарадзіла і ўзгадавала беларуская зямля, а дакладней, зямля Навагрудчыны.

**4. Праверка дамашняга задання.**

Дома вы складалі храналагічную табліцу «Жыццё і творчая спадчына А. Міцкевіча», звярніце ўвагу на больш падрабязную храналагічную табліцу (слайд 5).

Заданне: параўнайце дзве табліцы і звярніце увагу на тыя жыццевыя эпізоды, якія не адлюстраваны ў вашых падручніках.

Абмяркуйце пытанні ў групах.

1 група «Жыццёвыя этапы паэта»

2 група «Падзеі, якія паўплывалі на лёс паэта»

3 група «Чаму быў вымушаны большую частку свайго жыцця быць эмігрантам, выгнальнікам, вандроўнікам».

Абмеркаванне адказаў вучняў

*Зрабіце вынік*. Аб чым гавораць лічбы




Слайд 6

Задумаемся: аб чым гавораць лічбы? Ці не трагічна гэта для паэта?

**5. Жыццёвы шлях паэта – завочная экскурсія**

Словы настаўніка:

Калісьці вялікі Гётэ гаварыў: «Калі хочаш пазнаць паэта, ідзі на яго радзіму».


**Г. Л. Случанка,** настаўнік беларускай мовы і літаратуры гімназіі №19 г. Орша

© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

Давайце прыгадаем гэта падарожжа і завочна пабываем на Навагрудчыне.

*Мультымедыйная прэзентацыя завочнай экскурсіі па Навагрудчыне (вуснае паведамленне вучняў).*

## ЗАВОЧНАЯ ЭКСКУРСІЯ ПА МЯСЦІНАХ А. МІЦКЕВІЧА

*... Родны кут, свая радзіма –*
*Дзяцінства край! Спазнаўшы смак выгнання,*
*Ен дораг нам, як першае каханне,*

– прызнаваўся паэт у любові роднай Навагрудчыне. Давайце і мы з вамі пройдзем па зямлі, што натхняла паэта, – па мясцінах Адама Міцкевіча.

Дарога наша будзе скіравана найперш у **Завоссе** (слайд №7), дзе паэту было наканавана пабачыць свет. Які б маршрут мы ні выбралі, з якога боку ні кіраваліся ў Завоссе, перад вачыма паўстаюць тыповыя краявіды Навагрудчыны: невялічкія ўзгоркі і лагчынкі, лясы і пералескі. Мы адкрываем хараство ў неаглядных далях, у шырокіх прасторах палёў, міжвольна залюбуемся волатамі – дрэвамі, параскіданымі сярод палёў. Таксама некалі тут быў фальварак Міцкевічаў. На шчасце, цяпер ён адбудаваны.

«Зямля навагрудская, краю мой родны...» – пісаў са шчырым замілаваннем і любоўю А. Міцкевіч пра дарагую яго сэрцу Навагрудчыну.

У **Навагрудку** (слайд №8) прайшло дзяцінства і юнацтва паэта, тут яго бацькі купілі сядзібу, пабудавалі дом, у якім зараз месціцца музей вялікага паэта. Тут сабраны матэрыялы аб жыцці і вучобе паэта ў Навагрудку і Віленскім універсітэце, ёсць карта – макет Навагрудчыны, на якой паказаны памятныя міцкевічаўскія мясціны. Экспануюцца першыя выданні кніг, фотакопіі рукапісаў, карціны і партрэты вялікага песняра. Тут Адам слухаў беларускія песні, казкі, паданні, бегаў на Замкавую гару.

А. Міцкевіч любіў **Замкавую гару** (слайд №9), часта тут бываў, летуценіў, пісаў свае творы, аднаўляючы сівую даўніну свайго горада. Уздымемся на яе. На вялікім замчышчы, дзе калісьці стаяў сярэдневяковы замак, узвышаюцца дзве напаўразбураныя высокія вежы, ад якіх дыхае сівой мінуўшчынай. Глядзіш на сівыя муры, і на памяць прыходзяць радкі з паэмы “Гражына”:

*Ля Навагрудка, на ўздыбленых гарах, –*
*Замак у месяца срэбным зіхаценні;*
*Вал здзірванелы схаваўшы, сувора*
*Волатаў – вежаў ламаныя цені*
*Падалі ў роў, дзе між вечнай цясніны*
*Дыхалі воды, затканыя цінай.*

Тут, на замчышчы, любімае месца юнацкіх мар і радзіма паэта, тут нараджаліся творчыя планы, выспявалі неўміручыя радкі.

Тут, на замчышчы, узвышаецца своеасаблівы помнік – курган бессмяротнасці, насыпаны землякамі і прыхільнікамі паэта. Ён насыпаны з зямлі, прывезенай з усіх краін, дзе жыў Міцкевіч.

Унізе, ля гары, – **Фарны касцёл** (слайд 10), помнік XVI ст., у якім хрысцілі паэта.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

А насупраць, праз вулачкі і плошчу, – муры касцёла **Св. Міхаіла** (слайд 11), пры якім была дамініканская школа, дзе вучыліся Міцкевіч і Я. Чачот.

Крыху далей – **гара Міндоўга** (слайд 12), дзе, паводле народнай легенды, пахаваны князь Міндоўг са сваім залатым тронам. Гэтая гара не раз успамінаецца ў творах Міцкевіча.

А. Міцкевіч асабліва захапляўся возерам **Свіцязь** (слайд 13). Яно жывіла паэтава натхненне. У сваім творы «Свіцязь» ён запрашае падарожных палюбавацца красой гэтага цудоўнага возера. Міцкевіч любіў сустракацца тут з сябрамі і каханай, з леснікамі і рыбакамі, ад якіх слухаў легенды пра возера. Гэта і з'явілася прычынай напісання балады «Свіцязянка».

А Міцкевіч часта наведваў **Шчорсы** (слайд 14). Там знаходзіўся (і нават захаваўся і цяпер) знакаміты велічны стары дуб, якому мінула ўжо не адно стагоддзе, пад якім часта сядзеў Міцкевіч. Відаць, гэта дрэва ён меў на ўвазе у трэцяй і чацвертай кнігах «Пана Тадэвуша». Апісваючы дрымучыя беларускія лясы, зазначаў: «Дуб стары і барадаты пад цяжарам пяці вякоў стаіць гарбаты...»

Зараз накіроўваемся ў веску **Туганавічы** (слайд 15). Паказаўся старадаўні парк. У цэнтры – падмурак былога палаца, у якім жыла Марыя Верашчака, каханая паэта. Яны былі шчаслівымі (разам чыталі, дэкламавалі вершы, гулялі ў шахматы, музыцыравалі), але гэтае шчасце было, на жаль, вельмі кароткім: яна выйшла замуж. Перажытае Міцкевічам вылілася ў баладу «Свіцязянка».

Наперадзе – апошні пункт нашай экскурсіі – **хутарок Кут** (слайд 16), ля якога ўзвышаецца вялікі **камень-валун** (слайд 17), так званы «**камень філарэтаў**» (слайд 18). Тут, па паданю, у часе летніх канікул збіраліся Міцкевіч, Чачот, Т. Зан, чыталі свае творы, дзяліліся думкамі і планамі, марылі аб лепшым будучым.

Экскурсія наша падыходзіць да канца. Звярніце ўвагу на выяву самога паэта. На гранітным пастаменце ўзвышаецца **помнік А. Міцкевічу** (слайд 18). Выдатны пясняр, які марыў пра лепшую долю народа, пазірае ўдаль, дзе па-новаму заквітнела жыццё на беларускай зямлі.

Настаўнік прапануе вучням табліцу «Жыццё за мяжой»

| **Далейшы лёс Міцкевіча звязаны з** | **У розныя пярыяды жыцця сустракаецца з** |
|---|---|
| Расіяй | Бястужавым |
| Крымам | Пушкіным |
| Германіяй | Жукоўскім |
| Італіяй | Крыловым |
| Швейцарыяй | Грыбаедавым |
| Францыяй | Баршчэўскім |
| | Гётэ |
| | Шапэнам |
| | Гюго |
| | Бальзакам |

Сябра Міцкевіча А. Пушкін у рамане «Яўгеній Анегін» пісаў:


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

*Там пел Мицкевич вдохновенный*
*И, посреди прибрежных скал*
*Свою Литву воспоминал….*

**5. Тэма Радзімы у творчасці А. Міцкевіча**

– А цяпер давайце паслухаем, як праяўляецца любоў да Радзімы і туга ў творах самаго Міцкевіча. *Творчая справаздача групы чытальнікаў* (апераджальнае заданне)

На фоне музыкі («Паланэз» М. Агінскага) гучаць цытаты з твораў А. Міцкевіча

1. *Зямля Навагрудская!*
   *Край мой родны*
   *Славутага пяра Трамбецкага ты годны*
   *Красой садам Гумані ты і Віслы роўны –*
   *Не бачыць гэтага хіба дзіва вандроўны.*
   «Бульба»

2. *… О, як ён слухаў з любімых*
   *Вуснаў мову ліцвінаў, родную мову дзяцінства!*
   *З кожным словам ускрэслым быццам душа ажывала,*
   *Нібы з попелу іскры, мілыя назвы усплывадi;*
   *Саграваючы сэрца: крэўнасць і верная дружба*
   *І яшче саладзейшы выраз: каханне, якому*
   *На зямлі няма роўных, а проч слова Айчына.*
   «Конрад Валенрод»

3. *Як ціха! Спынімся! Я журавоў лёт чую,*
   *Якіх бы нават сокал быстры не углядзеў*
   *І як матыль калыша кветку палявую*
   *Як з шорахам вуж прапаўзае недзе.*
   *У гэты цішыні так чутка ўсё лаўлю я,*
   *Што чуў бы гук з Літвы.*
   «Акерманскія стэпы»

4. *Літва! Твой шумны лес мне пеў мілей тады,*
   *Чымся дзяўчаты тут, чым салаўі ў Байдарах;*
   *Я весялей таптаў дрыгву тваіх імшараў,*
   *Чым ананасаў і шаўкоўніцаў сады.*
   «Пілігрым»

Зрабіце вывад: Што аб’ядноўвае ўсе радкі?

Настаўнік звяртаецца да эпіграфа ўрока. Менавіта гэтымі радкамі пачынаецца паэма А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”

Работа па аналізу вобраза радзімы і тэмы любові да роднага краю ў паэме.

→ Успомніце час напісання паэмы?


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

→ Якія радкі паэмы сведчаць, што твор напісаны за межамі Радзімы?
→ Што называе Міцкевіч Літвой?
→ Што захапляе яго ў родным краі?

Вучні прыходзяць да высновы, што прырода – гэта частка любай сэрцу Міцкевіча Літвы; пра захапленні роднымі краявідамі ен выяўляе свае патрыятычные пачуцці.

**6. Абагульненне ведаў**

Работа ў групах.

***Творы А. Міцкевіча – гэта гісторыя Беларусі ў мастацкіх вобразах.***

Дакажыце гэта, абпіраючыся на веды, якія вы набылі на ўроку і прачытаўшы дома матэрыял падручніка.

**7. Вынікі ўрока. Рэфлексія**

Складанне класцера.

Падвядзём вынікі нашай работы і звернемся да схемы, якая стане абагульненнем нашай размовы на ўроку. У цэнтры гэтай схемы – паэт А. Міцкевіч.




– Якія асацыяцыі ўзніклі ў вас з іменем А. Міцкевіча як паэта, стваральніка твора «Пан Тадэвуш»?

– Якім павінен быць паэт, каб  напісаць такі твор?

**8. Дамашняе заданне**

– Не хацелася б ставіць кропку ў нашай размове. Таму давайце паставім ... бо наперадзе ў нас працяг вывучэння яго творчасці і выкананне дамашняга задання. У кожнага з вас на парце лісток з заданнямі.

**Заданні**

Выканайце адно з заданняў на выбар

1. Падрыхтаваць пераказ гісторыі Яцэка Сапліцы. Ведаць змест паэмы (1–4 р.)


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf

2. Творчае заданне. Напішыце водгук на любы твор А. Міцкевіча або паразважайце, наколькі знаёмства з роднымі мясцінамі пісьменніка натхняе спасціжэнню яго творчасці.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/sluchanka.pdf